**УДК 947.6**

# ДА ПЫТАННЯ АРЭАЛЬНАЙ ХАРАКТАРЫСТЫКІ КРУТУХІ НА ЗАХОДНІМ ПАДЗВІННІ

***В.В. Барышнікава***

*У артыкуле здзейснена спроба картаграфавання звестак пра крутухі – песенна-танцавальную форму фальклору, уласцівую традыцыі стараабраднікаў тэрыторыі заходняга Падзвіння. Традыцыйнае выкананне крутух уяўляе сабой спалучэнне шматлікіх кружэнняў з адмысловым песенным суправаджэннем “пад язык”. На аснове аналіза экспедыцыйных матэрыялаў і архіўных дадзеных акрэслены арэал распаўсюджвання крутух. Франтальнае абследаванне асобных локусаў дазволіла вызначыць характар тэрытарыяльнага замацавання з’явы як кропкавы. Наяўныя звесткі паказалі, што крутухі фіксуюцца пераважна ў месцах пражывання старавераў, але сталі часткай мясцовай лакальнай традыцыі і ўвайшлі ў рэпертуар аўтахтоннага насельніцтва.*

***Ключавыя словы:*** *крутуха, стараверы, стараабраднікі, Паўночная Беларусь, арэал, картаграфаванне, фальклор, лакальная традыцыя*

**Уводзіны.** Тэрыторыя заходняга Падзвіння характарызуецца пярэстым этнаканфесійным ландшафтам. Сярод мясцовага насельніцтва вылучаецца група рускіх старавераў, якая, у выніку расколу рускай праваслаўнай царквы, з другой паловы XVII ст. пачынае сяліцца ў дадзеным рэгіёне. Нягледзячы на досыць устойлівае ўяўленне пра рэлігійную адасобленасць і некаторую артадаксальнасць старавераў, яны мелі кантакты з аўтахтонным насельніцтвам, уступалі ў змешаныя шлюбы, бралі ўдзел у супольных абрадавых практыках каляндарна-земляробчага цыкла, што натуральным чынам спрыяла культурнаму ўзаемаабмену.

Традыцыйная абраднасць і народнамузычная культура старавераў з’яўляецца адметным феноменам: стараверы выступаюць прадстаўнікамі лакальнай фальклорнай традыцыі, якая ўяўляе сабой сінтэз карэннага (“мацярынскага”) і запазычанага (“аўтахтоннага”).

Замацаванне некаторых жанраў беларускага фальклору ў рэпертуары старавераў фіксавалася беларускімі [1–3] ды замежнымі [4-9] даследчыкамі. Аднак, пытанне ўздзеяння стараабрадніцкага фактару на этнамузычны ландшафт заходняга Падзвіння ў сукупнасці яго жанрава-функцыянальных, музычна-стылявых, выканальніцкіх, песенных, вербальных і харэаграфічных праяў не мела да гэтага часу спецыяльнага разгляду і з’яўляецца перспектыўнай задачай этнамузыкалагічнага вывучэння [10]. Мэтанакіраванае стацыянарнае даследаванне музычнага фальклору стараабраднікаў тэрыторыі заходняга Падзвіння, якое здзяйсняецца аўтарам з 2019 г. [11-13], выявіла наяўнасць адметных песенна-танцавальных практык, уласцівых менавіта стараабрадніцкім абшчынам. У складзе песенна-харэаграфічнага комплексу вылучаюцца крутухі, якія носьбіты-стараверы называюць яшчэ “пахадушкамі”, “карагодамі”, “круцелямі”, “крутушкамі” ці “хараводнымі”. Адзначым, што назва «крутуха» замацавана ў розных мясцовасцях Беларусі за традыцыйным танцам хуткага тэмпу, які ўключае разнастайныя кручэнні і суправаджаецца выкананнем прыпевак [14]. Аднак, у свядомасці жыхароў заходняга Падзвіння крутуха атаясамліваецца з песенна-танцавальнай традыцыяй старавераў і, часамі, супрацьпастаўляецца “мясцовым” танцам: *«Ну, дык усё ў старавераў былі такія ж... Як гэта даўней лявоніхі танцывалі, кадрылі там, падыспан як... во эта танцы! А яны ўсё крутухі танцавалі, хадзілі ўвакруг і каждый сабе піялі і піялі прыпеўкі. Ну, у маскалей гэта ўсё крутухі танцавалі на вечарыне»*[1], *«Гэта ўсе іхныя (старaверскія. — В. Б.) вечарыначныя танцы»*[2].

Высвятленне пытання этнічнай прыналежнасці крутух з’яўляецца актуальным для раскрыцця зместу з’явы ў складзе поліэтнічнай і поліканфесійнай культурнай прасторы заходняга Падзвіння. Картаграфаванне звестак пра крутухі дазволіць акрэсліць характар іх тэрытарыяльнага замацавання і раскрыць лакальную варыятыўнасць з’явы.

**Асноўная частка.** Сучасныя экспедыцыйныя даследаванні (экспедыцыя супрацоўнікаў АН РБ В. М. Прыбыловай і Т. Л. Канстанцінавай у Глыбоцкі раён (2012 г.); фіксацыі фальклорных экспедыцый Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (далей – БДАМ) у Пастаўскі раён (2003 г., кір.Т. Л. Бярковіч), Мёрскі раён (2009 г., экспедыцыя ажыццяўлялася прадстаўнікамі БДАМ, Латвійскай акадэміяй музыкі імя Я. Вітала і НАН РБ), Шаркаўшчынскі раён (2019 г., кір. Л. Ф. Баранкевіч); экспедыцыя Веткаўскага музея стараабрадніцтва і народных традыцый ім. Ф. Р. Шклярава ў Шаркаўшчынскі, Мёрскі, Глыбоцкі, Пастаўскі і Браслаўскі раёны (2021 г., кір. Г. Р. Нячаева); экспедыцыя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Мёрскі і Шаркаўшчынскі раёны (2022 г., кір. У. Я. Аўсейчык), уласныя фіксацыі аўтара ў Шаркаўшчынскім, Глыбоцкім, Мёрскім, Браслаўскім раёнах, выкананыя ў 2015-2022 гг.) і архіўныя матэрыялы (фонархіў ІМЭіФ НАН РБ, фонаархіў кабінета традыцыйных музычных культур БДАМ, прыватны архіў этнахарэолага М. А. Козенкі) дазволілі назапасіць досыць аб’ёмны матэрыял па народна-музычнай культуры старавераў-беспапоўцаў заходняй Віцебшчыны. Паводле зафіксаваных звестак, крутухі выконваліся яшчэ ў 1950-1960-х гадах пераважна на вечарынах, «днёўках», «маёўках», «складковых», якія прымяркоўваліся да калянадарных (у т. л. прастольных) святаў. Сустракаюцца згадкі пра выкананне крутух падчас Жаніцьбы Цярэшкі. Харэаграфічнай адметнасцю крутух з’яўляюцца шматлікія кружэнні пад рукой: *«і круцілісі пад руку», «і кругом за подручкі», «за руку захопюцца і кружуцца», «пакружуцца там і за “падруку” і танцуют», «кружут цябе нескака разоў».* Для крутух уласцівы хуткі тэмп выканання, бадзёры і жвавы характар руху. Ладаінтанацыйны комплекс большасці крутух прадстаўлены дыятанічным пентахордам квінтовага амбітусу (у некаторых узорах з захопам субтонаў). Назіраецца кантраст паміж першай і другой часткамі музычна-рытмавай формы, двухчасткавасць страфічнай формы з паўторнасцю вершарадка, разгорнутыя песенна-паэтычныя тэксты.

Нягледзячы на шматлікія згадкі пра наяўнасць крутух у мясцовай традыцыі, сёння зафіксаваць уласна выкананне крутухі з паказам песеннага і харэаграфічнага складнікаў ад інфармантаў 1940-х г.н. практычна немагчыма. Носьбіты адзначаюць, што крутухі выконваліся старэйшым пакаленнем. Менавіта таму асаблівую каштоўнасць для разгляду

[1] Зап. М. А. Козенка ў 1998 г. ад Дарашчонак Валянціны Усцінаўны, 1928 г. н., праваслаўнай, у в. Сасноўцы Шаркаўшчынскага р-на.
[2] Зап. В. Барышнікава ў 2019 г. ад Вайцюль Надзеі Іванаўны, 1964 г. н., праваслаўнай, у в. Каўшэлева Шаркаўшчынскага р-на.

музычна-стылістычнага, харэаграфічнага, жанравага, функцыянальнага аспектаў песенна-танцавальнай традыцыі старавераў уяўляюць нешматлікія аўдыё- і відэафіксацыі крутух (Мапа 1.)




**Мапа 1. — Аўдыё- і відэафіксацыі выканання крутух на тэрыторыі заходняга Падзвіння**

Самы ранні аўдыёзапіс крутухі, вядомы нам, — «Урадзілася Дуняша, эх, ні вяліка, ні мала» — быў зафіксаваны В. І. Ялатавым у 1963 г. у Браслаўскім раёне ад групы жанчын (А. І. Астроўскай 1911 г.н., Г. Д. Кацюн 1905 г. н., Т. В. Мацук 1920 г.н., А. В. Блажук), веравызнанне якіх даследчык не пазначыў. Этнамузыколаг Т. Б. Варфаламеева ў 1998 г. запісала крутуху «Ой, сляды мае, сляды» (маркер 1) у в. П’еўцы Браслаўскага раёна ад стараабрадніцы Смысловай Фяцініі Іванаўны 1921 г.н. У г. Браслаў быў здзейснены запіс яшчэ дзвух крутух «Ні будзіці маладую» і «Ва лузях» (маркер 2) (зап. Аўсейчык У. Я., Барышнікава В. В. 26.12.2021 г. ад Лаўрэнавай (Івановай) Кірыякіі Канстанцінаўны 1933 г.н., нар. у в. Самуйлы Браслаўскага р-на, стараабрадніца)

На тэрыторыі суседняга Шаркаўшчынскага раёна ў 1998 г. у в. Каўшэлева этнахарэолаг М. А. Козенка запісаў 10 крутух («Заінька серай, ні хадзі па сенім», «Насця мыла фартух», «Заінька па сенюшкам хадзіл, гулял», «На гарэ Ваня стаіт, «Ой, каваль мой, кавалёчак», «Между саду-вінаграду», «Міленькій, маленькій», «Пры ўдаліны куст малінавый стаял», «Ні будзіці маладую», «Во лузях, во зялёных лузях») (маркер 3) ад стараабрадніцы Фаміной Галіны Рыгораўны (1937-2000 гг.) з в. Барсучына. Харэаграфічныя элементы крутух «На гарэ Ваня стаіт» і «Заінька серай, ні хадзі па сенім» даследчык зафіксаваў на відэа. Крутухі «Заенька серый, ня бегай па сені» і «Ва кузніцэ» (маркер 4) былі зафіксаваныя ў в. Германавічы (зап. Барышнікава В.В. 25.10.2020 г. ад Рабіза Тамары Адамаўны 1923 г.н., нар. у в. Балбекі Шаркаўшчынскага р-на, праваслаўная). Каментуючы наяўнасць крутух у сваім рэпертуары, Тамара Адамаўна адзначала, што жыла ў атачэнні старавераў, з якімі разам хадзіла на танцавальныя вечарыны.

У вёсках Вялікая Кавалеўшчына і Наўгароды Мёрскага р-на Л. М. Салавей было запісана дзве крутухі — «Нарэдалася й Дуняша, ні вяліка, ні мала» (маркер 5) і «[Сля]ды мае, сляды, давялі міне сляды» (ад Браніславы Іванаўны Дуброўскай, 1916 г.н.) (маркер 6) У в. Кублішчына Мёрскага раёна не ўдалося запісаць уласна гукавога суправаджэння крутухі, аднак, відэафіксацыя пластычных танцавальных элементаў (маркер 7), запісаная ад старавераў вёскі — Васільевай Фаіны Карпаўны 1928 г.н., Паляковай Алімпіяды Іолістаўны 1944 г.н., Іванова Алімпія Рыгоравіча 1946 г.н. (зап. Барышнікава В.В., Свілёнак А.Б. 21.07.2020 г. у в. Кублішчына) дапаўняе звесткі аб асаблівасцях харэаграфічнага складніка крутух.

Узоры крутух з тэрыторыі Глыбоцкага раёна фіксаваліся ў выкананні стараабрадніц з колішніх буйных староверскіх вёсак Залессе (маркер 8) і Ластавічы (маркер 9). З в. Залессе — крутуха «Зарадзілася Дуняша» (Зап. Канстанцінава Т. Л., Прыбылова В. М. у 2012 г. ад Патарочынай Матроны Афанасьеўны 1927-2017 гг.). У г. Глыбокае адбыўся запіс крутух «Заенька серай» і «Зарадзілася Дуняша» (зап. Барышнікава В.В. 20.11.2020 ад Цімафеевай Кацярыны Іванаўны 1940 г.н., нар. у в. Ластавічы, пражывае з 1956 г. у г. Глыбокае).

У экспедыцыі М. А. Козенкі 1998 г. і студэнцкай экспедыцыі БДАМ 2001 г. (кір. Бярковіч Т. Л.) у Пастаўскі раён у г. п. Лынтупы была запісана стараабрадніца Барысава (Шубіна) Сцефаніда Афанасьеўна 1926 г.н., (нар. у в. Свіркай Свянцянскага раёна, Літва) стараабрадніцкага веравызнання. Сцефаніда Афанасьеўна праілюстравала наступныя крутухі: «Дзе ш ты была, Каценька», «Ні будзіці мыладую», «Воддаль саду-вінаграду», «Са в’юном я хажу», «Ішол Ваня даліною», «Ходзіт-едзет

Фалімон», «А мы сеілі лён»(маркер 10) У в. Кукляны Пастаўскага раёна зафіксаваны варыянт крутухі «Не будзіце маладу» (маркер 11) (зап. Барышнікава В. В., Карабовіч А.А, Цалка П. М. 12.07.2021г. ад Ясінскай, 1938 г.н., стараабрадніцы)

Картаграфаванне не толькі месцаў, з якіх паходзяць запісы выканання крутух, але і згадак пра іх існаванне ў мясцовай традыцыі, утварае наступную арэальную карціну (Мапа 2.):




**Мапа 2. — Звесткі пра наяўнасць крутух на тэрыторыі заходняга Падзвіння**

Як бачым, арэал распаўсюджання крутух на заходнім Падзвінні палягае ў тэрытарыяльна-адміністрацыйных межах Браслаўскага, Шаркаўшчынскага, Мёрскага, Глыбоцкага і Пастаўскага раёнаў. Гэта тэрыторыя былых Дзісненскага павета Віленскай губерні і Новааляксандраўскага павета Ковенскай губерні, у якіх пражывала вялікая колькасці старавераў рэгіёна [15].

Размяшчэнне кропак на мапе абумоўлена не толькі спецыфікай рассялення старавераў, але і недастатковай колькасцю звестак. Асобнага абследавання патрабуе паўднёвая частка Браслаўскага раёна ў ваколіцах г. п. Відзы. Тэрыторыя Пастаўскага раёна, з якога паходзіць адна звестка пра крутухі (в. Кукляны), таксама чакае ўвагі з боку даследчыкаў.

Звесткі пра наяўнасць крутух у Браслаўскім раёне паходзяць з вв. П’еўцы, Мінкавічы, Самуйлы, Булавішкі, Краснагорка, Кяпсні, Малькі. Шаркаўшчынскі раён: вв. Каўшэлева, Барсучына, Запруддзе, Кубелеўшчына, Вішнявец, Германавічы, Балбекі, Каралева, Прамяны, г. п. Шаркаўшчына, Астноўка, Сасноўцы, Варонка, Каршункі, Більдзюгі. Мёрскі раён: вв. Кублішчына, Фралоўшчына, Ніўнікі, Яўцерашкі, Моцеўкі, Маляўкі, Перабродадзе, Цвеціна, Вялікая Кавалеўшчына, Наўгароды, Мілейкі. Глыбоцкі раён: вв. Залессе, Ластавічы. У г. п. Лынтупы Пастаўскага раёна было запісана багата крутух ад Барысавай С. А., якая нарадзілася на літоўска-беларускім памежжы ў в. Свіркай Свянцянскага р-на.

Назіранне крутух у сістэме заходнепадзвінскіх песенна-харэаграфічных традыцый павінна быць суаднесена таксама з вынікамі, атрыманымі на сумежных тэрыторыях беларуска-латвійска-літоўскага памежжа. Экспедыцыйныя назіранні паказваюць, што разам з пашыранай ў рэгіёне назвай “крутуха”, сустракаюцца азначэнні “карагод”, “крутушка”, “хараводная”, “пахадушка”, “круцель”. Напрыклад, адзін і той жа напеў на тэкст «Ні будзіці маладую» у Пастаўскім раёне інфармант назваў “пахадушкай”, а ў Браслаўскім — “крутухай”. Пытанне нявызначанасці тэрміналогіі ў дачыненні песенна-харэаграфічных узораў, назіраў Іван Фрыдрых адносна фальклору старавераў Латгаліі, адзначаючы «трудность четкого деления на хороводные и плясовые, так как “в некоторых случаях одна и та же песня в одной деревне исполнялась как хороводная, а в другой — как плясовая, и наоборот”» [16].

**Высновы:** На тэрыторыі заходняга Падзвіння зафіксаваны 20 напеваў крутух і іх лакальных варыянтаў: «Заінька серай, ні хадзі па сенім», «Насця мыла фартух», «Заінька па сенюшкам хадзіл, гулял», «На гарэ Ваня стаіт», «Ой, каваль мой, кавалёчак», «Между саду-вінаграду», «Міленькій, маленькій», «Пры ўдаліны куст малінавый стаял», «Ні будзіці маладую», «Во лузях, во зялёных лузях», «Ва кузніцэ», «Зарадзілася Дуняша», «Ой, сляды мае, сляды», «Дзе ш ты была, Каценька», «Са в’юном я хажу», «Ішол Ваня даліною», «А мы сеілі лён», «Мой вяночык», «Ах, ты, зімушка-зіма», «Ходзіт-едзет Фалімон». Найбольш пашыранымі ў рэгіёне з’яўляюцца крутухі «Заінька серай, ні хадзі па сенім», «Зарадзілася Дуняша», «Ні будзіці маладую».

Франтальнае абследаванне асобных локусаў дазволіла вызначыць характар тэрытарыяльнага замацавання з’явы як кропкавы. Наяўныя звесткі паказалі, што крутухі фіксуюцца пераважна ў месцах пражывання старавераў. Можна меркаваць,

што крутухі сталі часткай мясцовай лакальнай традыцыі дзякуючы вечарынам, на якіх збіралася моладзь рознага веравызнання.: *«Ай, наверна ўсе ўмесце. Вот как я помню, ну, хадзілі ж, знаеце, днёўкі эці ўсякі, прыхадзілі праваслаўные і каталікі»*[1], *«Танцавалі ўсе ўмесце! Но толька, знаеце, стараверы іх пелі. Стараверы зналі эты крутухі пець, а танцавалі ўсе»*[2], *«Ай, усе! І каталікі, і стараверы, і каталікі. Не разбіралісі тамака, усе ўмесці»*[3]

Перспектывы вывучэння песенна-танцавальнай традыцыі стравераў заходняга Падзвіння звязаныя з працягам вывучэння яшчэ не абследаваных раёнаў (Пастаўскі, часткова Браслаўскі і Глыбоцкі) і уключэннем у поле даследавання матэрыялаў па музычнаму фальклору стараведаў Літвы і Латвіі, іх комплексным і сістэмным разглядзе ў аспекце ўключанасці ў этнакультурны ландшафт беларуска-літоўска-латвійскім памежжа.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка і інш.; склад. Т. Б. Варфаламеева. − Мінск : Бел. навука, 2004. − С. 525–529.
2. Фальклор Міёршчыны: Каляндар. святоч. -абрадавыя традыцыі Міёр. р-на Віцеб. вобл. / Літ. апрац. В. І. Басько. − Мінск : БелДІПК, 2002. − 96 с.
3. Канстанцінава, Т. Л. З экспедыцыйных назіранняў над сучаснымі песенна-абрадавымі практыкамі каляндарна-земляробчага і сямейна- радавога цыклаў Міёршчыны / Т. Л. Канстанцінава, Т. Л. Бярковіч // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі : навук.-тэатр. часопіс. − 2011. − No 18. − С. 4-9.
4. Леонова, Н. В. Белорусский фольклор в контексте сибирской славянской традиции // Славянский альманах-2002. – М., 2003. – С. 427-436.
5. Макашина, Т. С. Песни и сказки русского населения Латгалии / Т. С. Макашина // Русские в Латвии. Вып. 3. Из истории и культуры староверия. Изд. 2-ое / ред.-сост. Ил. И. Иванов. − Рига : ВЕДИ, 2003. − С. 206–224.
6. Оленкин, С. А. Русский и белорусский фольклор в Латвии на рубеже тысячелетий // С. А. Оленкин. − Кн. 1 : Песни, причеты и духовнные стихи, записанные у русских староверов Латгалии, латгальских белорусов, русских православных жителей псковско-латвийского пограничья. − 2017. − С. 74–185.
7. Фольклор старообрядцев Литвы : Тексты и исследование : в 3 т. Т. 3 : Народные песни. Частушки. Детский фольклор / издание подготовил Юрий Новиков при участии музыкологов Юрия Марченко, Ирены и Николая Захаровых. − Вильнюс : Издательство Вильнюсского педагогического университета, 2010. − 564 с.
8. Фурсова, Е. Ф. Традиционная культура старообрядцев Васюганья как результат межэтнических взаимодействий // Этнографическое обозрение. – 2009. – No 1. – С. 119-139.
9. Новиков, Ю. Пасхальный обход дворов у старообрядцев белорусско-литовского пограничья / Ю. Новиков // Kalbotyra : Slavistica Vilnensis. – 2002. – №. 51. – P. 81–92.
10. Канстанцінава, Т. Л. Аб уздзеянні міграцыных працэсаў другой паловы ХХ ст. на этнамузычны ландшафт Беларусі / Т. Л. Канстанцінава // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі : навук.-тэатр. часопіс. − 2017. − No 30. − С. 13-18.
11. Барышнікава, В. В. Крутуха ў этнамузычнай традыцыі заходняга Паазер’я: да пытання асаблівасцей функцыянавання ў асяродку стараабраднікаў Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці / В. В. Барышнікава // Сборник научных работ студентов Республики Беларусь «НИРС 2020» / редкол. : И. А. Старовойтова (пред.) [и др.]. − Минск : Изд. центр БГУ, 2021. − С. 518–522.
12. Барышнікава, В. В. Аб спецыфіцы функцыянавання крутух у асяроддзі стараабраднікаў в. Кублішчына Міёрскага раёна Віцебскай вобласці (па матэрыялах экспедыцыі 2020 г.) / В. В. Барышнікава // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : зб. навук. арт. Вып. 3 / гал. рэд. А. І. Лакотка; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. − Мінск : Права і эканоміка, 2022. − С. 694-697.
13. Барышнікава, В. В. Крутухі ў песенна-танцавальнай традыцыі стараабраднікаў Глыбоцкага раёна / В. В. Барышнікава // Фальклараыстычныя даследаванні : Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. навук. арт. Вып. 16 / рэдкал.: В. П. Рагойша (старш.) [і інш.].− Мінск : РІВШ, 2022. − С. 100-106.
14. Варламаў, А. Л. Крутуха // Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл. ; Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1989. – С. 274.
15. Аўсейчык, У. Я. Стараверы Паўночнай Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя: асаблівасці рассялення і дэмаграфічная характарыстыка / У. Я. Аўсейчык // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – С. 118-128.
16. Макашина, Т. С. Фольклор и обряды русского населения Латгалии. М. : Наука, 1979. – С. 119.



*The article attempts to map information about krutukhs - song and dance form of folklore, inherent in the traditions of the Old Believers worshipers of the territory of western Padzvinnie. The traditional performance of krutukhs is a combination of many circle moves with a special singing accompaniment "under the tongue". Based on the analysis of expeditionary materials and archival data, the area of distribution of krutukhs was defined. The frontal examination of individual loci made it possible to determine the nature of the territorial anchoring of the phenomenon as a point. The available data showed that krutukhs are fixed mainly in the places of residence of the Old Believers, but became part of the local tradition and entered the repertoire of the autochthonous population.*



***Keywords:*** *krutukha, Old Believers, Northern Belarus, areal, mapping, folklore, local tradition*.


[1] Зап. В. Барышнікава і А. Свілёнак 21.07.2020 г. ад Іванова Алімпія Рыгоравіча, 1946 г. н., стараабрадніка, у в. Кублішчына Міёрскага р-на

[2] Зап. В. Барышнікава і А. Свілёнак 21.07.2020 г. ад Васільевай Фаіны Карпаўны, 1928 г. н., стараабрадніцы, у в. Кублішчына Міёрскага р-на

[3] Зап. В. Барышнікава ў 2018 г . ад Грыгор’евай Зоі Мікалаеўны, 1934-2020 гг., стараабрадніцы, у в.. Германавічы Шаркаўшчынскага р-на.